**Шкрэда, Р.** Слаўны рэйд / Р. Шкрэда // Віцебскі рабочы. – 1970. – 8 крас. –С. 2 ; 24 крас. – С. 2–3.

## СЛАЎНЫ РЭЙД

**У настольным календары на лістку за 4 красавіка 1970 года ёсць скромны запіс:**

**«1942 – стварэнне ў Віцебскай вобласці 1-й Беларускай партызанскай брыгады пад камандаваннем М. П. Шмырова (Бацькі Міная)».**

**Але, як здарылася, што 1-я Беларуская партызанская брыгада, створаная і дзейнічаўшая ў былым Суражскім раёне да пачатку вызвалення Віцебшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, апынулася на берагах ракі Бярэзіна? Аб гэтых невядомых нашаму чытачу старонках з жыцця лясных салдат і напісаў былы камісар брыгады Р. Шкрэда.**

…Ішоў 1943 год. Гітлераўскае камандаванне было занепакоена бурным ростам партызанскага руху ў Прыдзвінні. Робячы раптоўныя налёты на камунікацыі, падраздзяленні і абозы з боепрыпасамі праціўніка, партызаны наносілі ворагу значныя страты. Нярэдка партызаны бралі ў палон салдат і афіцэраў праціўніка і дастаўлялі іх камандаванню Савецкай Арміі. Палонныя і адабраныя ў іх дакументы дапамагалі нашаму камандаванню своечасова разгадваць задумы і намеры ворага і прымаць меры для іх зрыву.

Праведзеныя фашыстамі карныя экспедыцыі супраць партызан у лютым – сакавіку і маі 1943 года не далі ім жаданых вынікаў. Гітлераўскае камандаванне рашыла любой цаной ачысціць прыфрантавую паласу ў Прыдзвінні ад партызан, дзе былі сканцэнтраваны атрады 1-й Беларускай, імя ВЛКСМ і 1-й Віцебскай партызанскіх брыгад.

Карыстаючыся зацішшам на фронце, вораг у першай палавіне чэрвеня 1943 года зняў з пазіцый 3-ю танкавую армію і сканцэнтраваў яе на ахове сваіх камунікацый, а асобныя злучэнні кінуў супраць партызан у раён Казловічы – Курына – Астроўскія. У раён Кавалёва – Забарочча – Сапроны было кінута два палкі 4-й авіяпалявой дывізіі з задачай ліквідаваць партызанскія атрады на паўночным усходзе ад Віцебска.

Разведка 1-й Беларускай брыгады своечасова выявіла сканцэнтраванне карнікаў і разгадала іх задуму. Камандзір брыгады Якаў Захаравіч Захараў загадаў партызанскаму атраду А. Гурко разграміць батальён карнікаў, які рухаўся лясной дарогай з вёскі Сапроны на Калінку.

На досвітку наступнага дня А. Гурко размясціў атрад у засадзе і нанёс карнікам моцны ўдар. На месцы бою праціўнік пакінуў да 90 чалавек забітымі, дзве аўтамашыны, 5 матацыклаў і 18 фурманак з боепрыпасамі і прадуктамі харчавання. Астатнія гітлераўцы ў паніцы ўцяклі, праследуемыя ротай А. Арэшчанкі.

Другая калона карнікаў, якая рухалася з вёскі Кавалёва, наткнулася ў лесе каля вёскі Забарочча на засаду атрада імя Курмялёва. У баі было знішчана да 60 гітлераўцаў, а астатнія ў беспарадку адступілі.

Так была сарвана першая спроба разграміць партызан.

Гітлераўскае камандаванне з дапамогай авіяцыі пачало блакіраваць лясы, дзе знаходзіліся галоўныя сілы партызан, і навязвала ім зацяжныя баі, каб выматаць народных мсціўцаў і прымусіць расходаваць запасы боепрыпасаў.

У гэты цяжкі для партызан момант Захараў па рацыі атрымаў дырэктыву Беларускага штаба партызанскага руху аб парушэнні чыгуначных камунікацый праціўніка метадам «рэйкавай вайны». Гэта аперацыя пад кодавай назвай «Канцэрт» павінна была разгарнуцца ў час пераходу нашых войск да рашучага наступлення пад Арлом і на Курскай дузе.

Камандаванне брыгады распрацавала канкрэтны план-заданне кожнаму атраду. Стварыліся дыверсійныя падрыўныя групы і тэрмінова накіроўваліся на чыгунку. Раптоўныя ўдары партызан па камунікацыях прымусілі варожае камандаванне накіраваць дадатковыя сілы на ахову чыгункі і ўзмацніць карныя меры.

У першай палавіне ліпеня 1943 года праціўнік зноў падцягнуў буйныя сілы і канчаткова блакіраваў Астроўскія і Шчалбоўскія лясы. Пры падтрымцы авіяцыі фашысты пачалі нападаць на партызанскія лагеры.

Знаходзячыся ў блакіраваным лесе, народныя мсціўцы з баямі прасочваліся ў тыл праціўніка і там вялі жорсткія баі з карнікамі. У гэтых аперацыях страты мелі абодва бакі, таму што манеўр у прыфрантавой паласе быў вельмі абмежаваны.

У сувязі з цяжкім становішчам камандзір брыгады Якаў Захараў па рацыі звярнуўся за дапамогай у Беларускі штаб. Каб разрадзіць абстаноўку ў зоне, штаб прапанаваў атрадам 1-ай Беларускай партызанскай брыгады пакінуць прыфрантавую паласу ў Прыдзвінні і сканцэнтравацца ля берагоў Бярэзіны ў трохвугольніку Крупкі – Барысаў – Лепель.

Выконваючы загад штаба, камандаванне брыгады стварыла зводны атрад з 200 чалавек на чале з А. Гурко. Камісарам быў прызначан Ф. Булахаў, начальнікам штаба – Н. Бальшакоў.

Ноччу з 16 на 17 ліпеня 1943 года атрад А. Гурко фарсіраваў Заходнюю Дзвіну і прыйшоў у Задзвінскую пушчу (Бабініцкі сельсавет Віцебскага раёна), а ноччу з 17 на 18 ліпеня перайшоў шасэ Віцебск – Сураж і спыніўся ў лесе каля вёскі Паддуб'е, ведучы разведку для пераходу шасэ Віцебск – Смаленск.

Услед за атрадам А. Гурко ў Бабініцкі сельсавет пераправіліся атрады А. Пагарэлава і М. Машкова. Але праціўнік разгадаў задуму партызан, падкінуў з Віцебска падмацаванні, блакіраваў дарогу Віцебск – Сураж і разарваў сувязь атрада А. Гурко з асноўнымі сіламі 1-й Беларускай партызанскай брыгады. Атрады А. Пагарэлава і М. Машкова вярнуліся ў размяшчэнне брыгады. Гурко рашыў пераход рабіць толькі ноччу, а днём маскіравацца ў лесе, ведучы старанную разведку.

Ноччу з 19 на 20 ліпеня перайшоў шасэ Віцебск – Смаленск і да раніцы дасягнуў лесу каля вёскі Хоцімля і выслаў групу, каб разведаць пераход цераз чыгунку Віцебск – Смаленск, якія моцна ахоўваліся гітлераўцамі.

У наступную ноч каля вёскі Ціханаўка атрад перайшоў гэту чыгунку, але сутыкнуўся з аховай праціўніка, разбіў яе і рушыў наперад. Атрад адарваўся ад праціўніка, фарсіраваў раку Ласасіна, на досвітку дасягнуў лесу каля вёскі Шніткі і размясціўся на адпачынак.

27 ліпеня 1943 года праціўніку ўдалося выявіць атрад. У лесе завязаўся бой. Партызаны адкінулі ворага.

У пачатку жніўня 1943 года камандаванне атрада стварыла баявую групу разведчыкаў на чале з лейтэнантам Н. Мільнічуком з задачай скрытна прайсці ў раён Янова былога Багушэўскага раёна, адшукаць участак для бяспечнага пераходу цераз шасейную дарогу і чыгунку Віцебск – Орша, адначасова звязацца з партызанскімі атрадамі , што дзейнічалі ў былым Багушэўскім і Сенненскім раёнах.

Праз некалькі дзён разведка вярнулася. Н. Мельнічук далажыў, што пераход цераз камунікацыі Віцебск – Орша вельмі цяжкі, шасейная дарога і чыгунка ўзмоцнена ахоўваюцца гітлераўцамі, але ноччу ў непагадзь пры найстражэйшым захаванні цішыні перайсці можна.

Атрад быў ужо гатовы да выхаду, калі баявая ахова далажыла, што ў бок размяшчэння яго рухаюцца фашысты. Па трывозе атрад заняў абарону. Падпусціўшы гітлераўцаў на 100 метраў, партызаны атакавалі ворага. Фашысты кінуліся ўцякаць, пакінуўшы на полі бою 7 чалавек забітымі і кулямёт. Партызаны страт не мелі.

У ноч на 29 жніўня пад праліўным дажджом атрад перайшоў шасейную дарогу і чыгунку Віцебск – Орша, прыбыў у Сенненскі раён і спыніўся ў вёсцы Федэратыўная Ульянавіцкага сельсавета. Там атрад ад партызан брыгады В. С. Ляонава папоўніўся боепрыпасамі і неўзабаве пачаў баявыя аперацыі на камунікацыях праціўніка.

Я прыбыў у партызанскі атрад А. Гурко 25 верасня 1943 года. Разам са мной прыляцелі радыстка М. Лібіна і капітан С. Бабенкаў, накіраваны да нас Беларускім штабам партызанскага руху для вядзення разведкі.

За час майго знаходжання на Вялікай зямлі і за час рэйду атрада Гурко з Прыдзвіння па тылах 3-ай танкавай арміі праціўніка адбыліся вялікія змяненні. На савецка-германскім фронце ініцыятыва перайшла ў рукі нашых войск. Пад Курскам бітва закончылася разгромам нямецка-фашысцкіх войск, нашы воіны адкінулі ворага за Днепр і дайшлі да Гомеля. У верасні 1943 года пасля ўпорных баёў войскі Калінінскага і Заходняга франтоў прарвалі абарону праціўніка пад Духаўшчынай і Ярцавам і вызвалілі Смаленск. У кастрычніку нашы войскі вызвалілі Веліж Смаленскай вобласці, Лёзна і Сураж. Фронт спыніўся пад Віцебскам. Партызаны 1-ай Беларускай партызанскай брыгады, што дзейнічалі ў Суражскім раёне, злучыліся з часцямі Савецкай Арміі.

Атрад Гурко, які знаходзіўся тады ў Сенненскім раёне, значна папоўніўся людзьмі з мясцовага насельніцтва, стаў больш моцным. Таму Беларускі штаб партызанскага руху прапанаваў рэарганізаваць атрад у брыгаду пад флагам 1-ай Беларускай. У другой палавіне кастрычніка брыгада сканцэнтравалася на тэрыторыі Кашчынскага і Красналуцкага сельскіх Саветаў Халопеніцкага раёна Мінскай вобласці (цяпер Чашніцкі раён Віцебскай вобласці).

Вывучыўшы абстаноўку ў новым раёне, камандаванне брыгады праз камісараў і сакратароў партыйных арганізацый пры атрадах выявіла ў населеных пунктах пражываючых там камуністаў і неўзабаве стварыла тры партыйныя арганізацыі.

Камуністы падпольных партыйных арганізацый пад кіраўніцтвам камісараў атрадаў таварышаў Ф. П. Булахава, І. Янкевіча і М. Горакава праводзілі сярод насельніцтва вялікую палітычную работу, дапамагалі атрадам у зборы разведвальных даных, дапамагалі выкрываць ілжывую прапаганду ворагаў. Камуністы распаўсюджвалі сярод насельніцтва нашу літаратуру, газеты, лістоўкі і своечасова паведамлялі аб намерах ворага.

Добра працавалі сярод насельніцтва камуністы М. Каваленка, Таццяна Гук, аб якой размова будзе наперадзе. Пазней мы звязаліся з Халопеніцкім падпольным райкомам КПБ. Я быў уведзены ў састаў райкома.

Брыгада пачала паспяхова праводзіць баявыя аперацыі. 30 кастрычніка 1943 года атрад Д. Баранава на дарозе Забоенне – Красналукі разграміў вялікі абоз праціўніка, знішчыў 27 салдат і афіцэра, 13 паліцэйскіх, узяў у палон трох гітлераўцаў.

1 лістапада 1943 года камандзір другога атрада Н. Мільнічук, разлічыўшы, што да месца бою павінны прыбыць гітлераўцы за трупамі забітых салдат, арганізаваў на ўзлеску засаду. Пры падыходзе ворага да месца бою партызаны адкрылі ружэйна-кулямётны агонь і забілі 15 карнікаў. У гэтым баі загінуў наш кулямётчык Г. Граматчыкаў.

4 лістапада 1943 года партызанскі атрад пад камандаваннем Д. Баранава пры садзейнічанні атрада Н. Мільнічука ліквідаваў гарнізон гітлераўцаў у вёсцы Забоенне і знішчыў 22 гітлераўцаў, 12 паліцэйскіх, а астатнія ўцяклі. Тым самым быў ліквідаван умацаваны пункт гітлераўцаў, што прыкрываў подступы да магістралі Лепель – Барысаў.

Смелую аперацыю 4 сакавіка 1944 года правялі партызаны атрада Н. Мільнічука. Дарогу Чарэя – Крупкі перасякае рака Эса. Мост на гэтай рацэ ахоўваўся варожым падраздзяленнем у 40 чалавек, якія мелі на ўзбраенні 4 станкавыя кулямёты, аўтаматы і вінтоўкі. Подступы да моста былі акружаны сеткай драцяных загарод, трыма дзотамі. У вялікім бункеры, укапаным у зямлю, размяшчалася ахова. На бункеры была ўстаноўлена вышка з кулямётам з кругавым сектарам абстрэлу. Ахоўваўся мост старанна. Праз яго немцы прапускалі толькі жанчын, якія ў рэчавых мяшках насілі льнасемя і абменьвалі ва ўправе вёскі Слабада на соль.

Камандаванне брыгады рашыла разграміць гарнізон моста ўдзень. Для гэтага была створана ўдарная група з 17 чалавек, узброеная пісталетамі і гранатамі, але пераапранутая ў жаночае адзенне. Кіраваць групай было даручана разведчыцы Пашы Васіленка. Дзвюма групамі прыкрыцця кіраваў намеснік камандзіра атрада па разведцы Міхаіл Лізуноў.

І вось штурмавая група раніцай накіравалася з мяшкамі за плячыма ў бок моста. Наперадзе ішла Паша Васіленка і партызанка Марыя Казлова, а ззаду партызаны, пераапранутыя ў жаночае адзенне.

На мосце Паша выйшла наперад. Дайшоўшы да вартавога, яна прад’явіла пашпарт, пачаставала салдата яйкамі. Той патрабаваў самагонкі. Паша сказала, што шнапс нясуць жанчыны, што ідуць ззаду. Вартавы ўзрадаваўся і крыкнуў нешта ў бок бункера. Адтуль выскачылі два дзясяткі салдат без зброі і пачалі чакаць падыходу «жанчын».

Ступіўшы на мост і параўняўшыся з гітлераўцамі, партызаны пачалі ва ўпор расстрэльваць фашыстаў. Частка з іх кінулася ў бункер, услед за імі паляцелі гранаты.

У гэты час на мост на санях уварваліся групы прыкрыцця. Мінёры І. Галушка і С. Зайцаў падрыхтавалі зарады толу і кінулі ў бункер. Адбыўся выбух. Пад абломкамі бункера загінулі ўсе гітлераўцы, што знаходзіліся там. А на мосце засталіся ляжаць афіцэр і 11 салдат.

Такім чынам, гарнізон быў ліквідаван. З бункера выцягнулі два кулямёты, 20 вінтовак, узарвалі мост і зніклі. Нашы страты: забіты партызаны Гайнутранаў і Сяргееў, лёгка ранена 6.

У сакавіку 1944 года брыгада перайшла ў падначаленне аператыўнай групы па кіраўніцтву партызанскім рухам пры 3-м Беларускім фронце. Начальнік аператыўнай групы палкоўнік Архангельскі паставіў перад брыгадай задачу: устанавіць сістэму абаронных збудаванняў, узводзімых гітлераўцамі ў раёнах Бобр – Крупкі – Барысаў і на берагах рэк Бярэзіна – Гайна. Для перадачы разведвальнай інфармацыі нам была самалётамі дастаўлена другая рацыя з радыстам Анатолем Вяршыніным.

Партызаны з гонарам выканалі адказнае заданне. У зборы разведвальных даных значную дапамогу аказалі нам савецкія людзі, якія працавалі на абаронных збудаваннях і знаходзіліся ў

гарнізонах праціўніка. Асабліва вялікую работу па збору разведвальных звестак у горадзе Барысаве правяла камуніст Таццяна Пятроўна Гук (па мужу Дзягель).

Камандаваннем брыгады Таццяна была накіравана ў Барысаў у канцы кастрычніка 1943 года. Да вайны яна працавала ў горадзе ў адной са школ, добра ведала Барысаў і мела многа знаёмых.

Тав. Гук удалося арганізаваць у горадзе невялікую, але актыўную групу. У яе ўвайшлі сёстры Ніна і Настасся Кошкіны і іншыя савецкія патрыёты. Праз нашага сувязнога А. Малчанскага мы атрымлівалі ад Таццяны каштоўную інфармацыю і давалі ёй заданні.

Па даных Т. Гук наша авіяцыя неаднаразова бамбіла ў Барысаве ваенныя аб’екты і эшалоны з боепрыпасамі і тэхнікай праціўніка. Але ў пачатку красавіка 1944 года сувязь з Таццянай абарвалася. Нехта выдаў яе. Яна доўга сядзела ў гестапа і была расстраляна напярэдадні вызвалення Барысава нашымі войскамі.

У красавіку 1944 года гітлераўцы пачалі супраць партызан Лепельска-Полацкай партызанскай зоны буйную карную экспедыцыю. На нас былі кінуты рэгулярныя часці, танкі і артылерыя. Аперацыяй кіраваў камандуючы 3-й танкавай арміяй генерал-палкоўнік Рэйнгранд.

Перад атрадамі нашай брыгады была пастаўлена задача разам з барысаўскімі партызанамі актывізаваць баявыя дзеянні ў трохвугольніку Крупкі – Барысаў – Лепель, каб адцягнуць частку сіл экспедыцыйнай групоўкі з Лепельска-Полацкай зоны.

4 красавіка 1944 года атрад Д. Баранава паміж вёскамі Адамова і Сялец наладзіў засаду. Аўтакалона з 70 гітлераўцамі, якая рухалася па дарозе, была сустрэта ружэйна-кулямётным агнём. Бой працягваўся 45 мінут. У выніку было знішчана 5 аўтамашын. Легкавая машына была захоплена партызанамі, а затым узарвана. Забіта 38 гітлераўцаў, сярод іх обер-лейтэнант. Захоплена 18 вінтовак, 3 кулямёты, 9 аўтаматаў і мінамёт з мінамі. З нашага боку было ранена 4 партызаны.

6 красавіка 1944 года ўзвод партызан першага атрада стаяў у вёсцы Забоенне. Фашысты падышлі да вёскі і спрабавалі знішчыць узвод, але баявая ахова заўважыла праціўніка і ўзняла трывогу. Камісар атрада Ф. П. Булахаў, што знаходзіўся пры ўзводзе, узяў два аддзяленні партызан з кулямётамі, зайшоў у тыл гітлераўцаў і завязаў там бой. Нягледзячы на перавагу, праціўнік адступіў, пакінуўшы на полі бою 17 забітых. У гэтым няроўным баі смерцю храбрых загінуў Ф. П. Булахаў. Партызаны жорстка адпомсцілі гітлераўцам за смерць любімага камісара.

Усяго брыгада ў красавіку знішчыла 165 гітлераўцаў, 27 паліцэйскіх, падарвала на мінах 9 грузавых аўтамашын з жывой сілай і боепрыпасамі, тры легкавыя аўтамашыны, узарвала два масты і выратавала ад угону ў рабства 300 савецкіх грамадзян.

Красавіцкая экспедыцыя гітлераўцаў бясслаўна правалілася. Надышоў май 1944 года. Выкарыстоўваючы зацішша на фронце, гітлераўцы пачалі ўзмацняць барацьбу супраць партызан, прыцягваючы для гэтага войскі з фронту.

Вайсковыя часці фашыстаў пачалі канцэнтравацца ў раёнах Лепеля, раз’езда 116, Чашнік. Адначасова варожае камандаванне стварыла карную групоўку ў раёне Сянно – Барысаў. Супраць партызан былі кінуты 95-я, 337-я і 262-я пяхотныя дывізіі, многа артылерыі і авіяцыі. Барацьба прымала ўсё больш напружаны характар.

Атрады брыгады, пазбягаючы акружэння і маняўруючы ў паўночнай частцы Барысаўскага раёна, шляхам засад і раптоўных налётаў наносілі контрудары па карніках. У ноч на 2 мая 1944 года група падрыўнікоў пад кіраўніцтвам Сямёна Сіроткіна на чыгунцы Крупкі – Барысаў падарвала

200 рэек. 4 мая партызанскі атрад Д. Баранава на дарозе Дрымаўшчына – Чэрцы арганізаваў засаду, у якую трапіла калона фашыстаў са 100 чалавек. Атрад знішчыў 33 гітлераўцаў, а астатніх прымусіў уцячы. Партызаны захапілі 10 вінтовак, 9 аўтаматаў, адзін кулямёт і фурманку з гранатамі і боепрыпасамі.

Маняўруючы ў трохвугольніку Крупкі – Барысаў – Лепель, партызаны ў час майскай экспедыцыі правялі 19 баявых аперацый. Шляхам засад і дыверсій знішчылі 147 гітлераўцаў, падарвалі 5 грузавых аўтамашын, зрабілі дыверсійныя акты на чыгунцы і знішчылі 3 кіламетры сувязі.

Майская экспедыцыя гітлераўцаў таксама правалілася, нягледзячы на тое, што яна была старанна падрыхтавана.

Чэрвень 1944 года быў завяршаючым этапам барацьбы партызан з гітлераўскімі захопнікамі. На гэты раз супраць нас было кінута больш сіл. Вораг пачаў адціскаць партызан з усходу і захаду, каб на рацэ Бярэзіна акружыць і знішчыць іх. Але задума гітлераўскага камандавання і на гэты раз правалілася. Партызаны падрыхтаваліся да жорсткіх баёў. Камандаванне нашых франтоў забяспечыла нас боепрыпасамі, узрыўчаткай і медыкаментамі. Раненыя партызаны былі вывезены за лінію фронту.

Калі гітлераўцы пачалі наступленне, атрады брыгады, ведучы баі з карнікамі ў раёне вёсак Лінавец – Зароўе, пазбягаючы акружэння, з баямі выйшлі ў пачатку чэрвеня на дарогу Лепель – Барысаў у Домжарыцкія лясы і занялі абарону на ўзлеску вёсак Церашкова – Бярэзінскі. Праціўнік блакіраваў дарогу Лепель – Барысаў і пачаў весці баявую разведку ляснога масіву з усходу і адначасова блакіраваў дарогу Лепель – Бярэзіна – Бягомль. Побач з карнымі мерапрыемствамі фашысты праводзілі вялікую агітацыйную работу. Яны арганізавалі спецыяльны выпуск газет, лістовак, адозваў і пракламацый, якія скідваліся з самалётаў разам з бомбамі ў месцы сканцэнтравання партызан.

12 чэрвеня 1944 года палітруку роты першага атрада У. Юзаву была пастаўлена задача знайсці месца для выхаду атрадаў брыгады з блакіраванага лесу. На выкананне гэтай задачы добраахвотна выказалі жаданне пайсці 28 партызан. На дарозе з вёскі Сялец на вёску Дуброва група Юзава выявіла дзот праціўніка. Разведаўшы падступы, разведчыкі атакавалі дзот і гранатамі знішчылі аддзяленне фашыстаў з кулямётным разлікам. Узяўшы кулямёт і 4 вінтоўкі, група Юзава вярталася ў сваё размяшчэнне, але на шляху зноў сустрэла групу фашыстаў, якія ішлі ў напрамку дзота. У. Юзаў арганізаваў засаду. Калі ворагі падышлі на 100 метраў, партызаны адкрылі дружны агонь. На полі бою засталося 11 трупаў. Астатнія фашысты ў паніцы ўцяклі. У гэтай аперацыі У. Юзаў быў ранены, але ён мог рухацца, прыйшоў у размяшчэнне брыгады і прынёс каштоўныя звесткі.

На досвітку 20 чэрвеня 1944 года ўсе атрады нашай брыгады перайшлі дарогу Лепель – Барысаў. 23 чэрвеня 1944 года пачаліся наступальныя аперацыі па разгрому групы армій «Цэнтр» у Беларусі. Злучэнні 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў на Віцебскім напрамку прарвалі абарону 3-й танкавай арміі праціўніка і рушылі на захад. У перыяд наступлення нашых войск гітлераўскае камандаванне ў Лепелі выдзеліла з рэзерву батальён палявой жандармерыі і паставіла перад ім задачу спаліць усе населеныя пункты і ўгнаць усё працаздольнае насельніцтва.

Два атрады нашай брыгады каля вёскі Дабрамыслі прынялі жорсткі бой з жандарамі, які працягваўся больш гадзіны. Праціўнік страціў 27 чалавек забітымі, але вёску Дабрамыслі заняў і пачаў крывавую расправу над яе жыхарамі.

Неадкладна быў уведзен у бой трэці партызанскі атрад пад камандаваннем І. Гукава. Усе тры атрады атакавалі праціўніка і завязалі бой у самай вёсцы. У жорсткім баі партызаны выбілі жандараў з вёскі, праціўнік уцёк у бок Лепеля, пакінуўшы яшчэ 17 трупаў і нарабленую маёмасць.

У гэтым баі смерцю храбрых загінулі начальнік штаба 3-га атрада Н. Сямёнаў, разведчыкі 1-га атрада камандзір аддзялення М. Івашнёў, яго баявыя сябры І. Сталярчук, В. Дзірко, А. Данілюк, В. Осіпаў, В. Валевіч, В. Гуц. Было ранена 11 партызан.

28 чэрвеня 1944 года партызаны брыгады сустрэліся з савецкімі танкістамі. З вялікай радасцю народныя мсціўцы селі на танкі «Т-34» і разам з танкістамі пачалі граміць варожыя гарнізоны.

У мястэчку Красналукі з дапамогай танкістаў партызаны захапілі мост цераз раку Эса, падрыхтаваны гітлераўцамі для ўзрыву. Гэта дало магчымасць нашым войскам бесперашкодна рухацца на Барысаў. Партызаны ўзялі многа палонных, адбілі ў гітлераўцаў шмат жывёлы.

Усяго ў чэрвені партызаны брыгады, маняўруючы ў трохвугольніку Крупкі – Барысаў – Лепель, правялі 47 баявых аперацый, знішчылі 343 гітлераўцаў, узялі ў палон 158, з іх 19 афіцэраў, падарвалі адзін танк, адну гармату, 9 грузавых аўтамашын, 5 матацыклаў, 18 падвод, два масты.

У перыяд наступлення нашых войск мы аказвалі пасільную дапамогу савецкім воінам у вызваленні нашай вобласці, не далі праціўніку магчымасці свабодна манеўраваць аператыўнымі рэзервамі, зрывалі падвоз боепрыпасаў да фронту, ратавалі тысячы людзей ад угону ў рабства.

28 ліпеня 1944 года 1-я Беларуская партызанская брыгада была расфарміравана. Сотні партызан пайшлі ў радах Савецкай Арміі дабіваць фашыстаў у іх логаве, а астатнія ўзяліся за аднаўленне разбуранай вайной народнай гаспадаркі.

***

**Амаль 25 год аддзяляюць нас ад апошніх залпаў Другой сусветнай вайны. Час залечвае раны, гасіць боль страт. Але мы да гэтага часу помнім былыя паходы па лясных партызанскіх сцежках, трывожныя і бяссонныя ночы пад адкрытым небам, штодзённыя сустрэчы са смерцю.**

**Мы шчаслівыя тым, што былі маленькай кроўнай часцінкай нашага народа, які выйграў такую цяжкую вайну, што ўнеслі пасільны ўклад у нашу вялікую Перамогу.**

**Р. ШКРЭДА,**
былы камісар 1-й Беларускай партызанскай брыгады